ДУК «Шаркаўшчынская ЦБС»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Чалавек працай



Чалавек працай славіцца, бо праца – гэта крыніца радасці і задавальнення. Працуючы, чалавек развіваецца як фізічна, так і маральна. Ад працы залежыць яго дабрабыт.

Нашы продкі з ранняга дзяцінства прывучалі дзяцей да працы, а ў якасці правілаў працоўных паводзінаў выступалі прымаўкі і прыказкі.

"Праца для чалавека – здароўе і жыццё, бо "хто прывык працаваць, таму без справы не сядзіцца". Аб людзях, якія ўсё ўмеюць, кажуць: "І швец, і жнец, і на дудзе ігрэц", -- гэта значыць умелы, працавіты чалавек. Такіх заўсёды паважаюць і цэняць.

На нашай шаркаўшчынскай зямлі жывуць мудрыя і таленавітыя людзі, сціплыя, нястомныя працаўнікі, якія:

"працуюць і песні пяюць –<br>Павялося здаўна так і будзе –<br>Услаўляючы край і зямлю,<br>Працавітыя шчырыя людзі".

Якую б галіну народнай гаспадаркі мы не ўзялі б, яе развіццё немагчыма ўявіць без ініцыятыўных і адказных, працаваітых работнікаў. У нашым раёне склалася выдатная традыцыя – ушаноўваць людзей, чый талент і энергія служаць умацаванню эканамічнага патэнцыялу рэгіёна, якія ўносяць сваю лепту ў фарміраванне іміджу раёна, ствараюць духоўныя каштоўнасці.

Шаркаўшчынскі выканаўчы камітэт прыняў рашэнне штогод, пачынаючы з 2011 года, прысуджаць лепшым прадстаўнікам прадпрыемстваў і арганізацый, унёсшых важкі ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё раёна, Ганаровае званне "Чалавек года Шаркаўшчыны", а фатаздымкі лепшых працаўнікоў устаноў і арганізацый раёна штогод заносіць на раённую Дошку гонару.

Матэрыял можа быць выкарыстаны бібліятэкарамі для правядзення масавых мерапрыемстваў краязнаўчага характару, а таксама настаўнікамі і вучнямі для заняткаў гуртка па краязнаўству, класных і інфармацыйных гадзін.

# Гараніна Ларыса Віктараўна

***дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Лужкаўская сярэдняя школа»***



Стварыць умовы для гарманічнага развіцця асобы лічыць галоўным у сваёй рабоце.

Лужкаўская сярэдняя школа – адна з самых вялікіх па колькасці навучэнцаў у нашым раёне, у ёй вучацца 174 вучні. Яна мае багатыя традыцыі навучання і выхавання. Тут школьнікі набываюць веды, займаюцца спортам, працуюць на прысядзібным участку, удзельнічаюць у розных праектах, конкурсах, займаюць прызавыя месцы на алімпіядах. Адным словам, вядуць актыўнае, цікавае, напоўненае падзеямі жыццё. Ва ўсім гэтым бачыцца заслуга педагагічнага калектыву на чале з дырэктарам школы Ларысай Віктараўнай Гаранінай.

Ларыса Віктараўна з самага дзяцінства марыла стаць настаўніцай беларускай мовы і літаратуры, менавіта гэтыя прадметы падабаліся найбольш. Таму іншага шляху акрамя педагагічнага і не ўяўляла. Скончыла педінстытут у Віцебску і вярнулася ў родныя мясціны. Працоўную дзейнасць пачынала настаўніцай пачатковых класаў Улінаўскай базавай школы, працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Стральцоўскай БШ, з 2002 па 2006 год была яе дырэктарам. Калі ў 2006 годзе была прызначана на пасаду дырэктара Лужкаўскай СШ, было пэўнае хваляванне, як атрымаецца справіцца з вялікай адказнасцю. Яле яно аказалася дарэмным. Любоў да вучняў, уменне адшукаць агульную мову з калегамі. Самадысцыпліна. Творчы падыход і пошук новых метадаў работы – гэтыя якасці вызначаюць дзейнасць Ларысы Віктараўны на пасадзе дырэктара і дапамагаюць стварыць у школе спрыяльную для ўсебаковага гарманічнага развіцця асобы вучняў атмасферу. Вялікая работа ў перыяд яе кіраўніцтва праведзена па рамонце школы, добраўпарадкаванню, эстэтычнаму афармленню. Асаблівым прадметам гонару Лужкаўскай школы з'яўляецца прышкольны ўчастак, які складаецца з пладовага саду, дэндрарыя, зоны адпачынку. Калі школу наведваюць госці (а ім у Лужках заўсёды рады), то паглядзець ёсць на што. Прысядзібны ўчастак прыносіць і практычную карысць: тут для ўласных патрэб школы вырошчваюцца гародніна, кветкі, лекавыя травы. Штосьці ідзе і на продаж, прыносячы школе прыбытак. За сваю плённую работу Ларыса Віктараўна неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі і падзякамі. Часта яна ўдзельнічае ў педагагічных канферэнцыях па раённым, абласным, рэспубліканскім узроўнях, на якіх дзеліцца вопытам работы.

Шматлікія адміністрацыйныя абавязкі не перашкаджаюць дырэктару школы займацца непасрэдна педагагічнай дзейнасцю. Ларыса Віктараўна скончыла курсы павышэння кваліфікацыі і выкладае інфарматыку, стараецца зрабіць урокі цікавымі і пазнавальнымі.

Ну, а доказам любові вучняў да сваёй школы з'яўляецца тое, што выпускнікі пры любой магчымасці стараюцца наведаць навучальную ўстанову, дзе калісьці рабілі першыя сур'ёзныя крокі ў жыцці.

# *Дабравольскі Канстанцін Дзмітрыевіч*



Нарадзіўся 7 лютага 1941 г. у в. Галінова. У 1948 г. пайшоў вучыцца ў Казакоўскую сямігадовую школу. Закончыў 5 класаў. Далей вучыцца не меў магчымасці, трэба было працаваць, дапамагаць у сям'і. У 1956 г. пачаў працаваць прыцэпшчыкам у калгасе імя Леніна і з гэтага часу звязаў сваё жыццё з тэхнікай. У арміі закончыў курсы трактарыстаў. У снежні 1963 г. вярнуўся ў родную гаспадарку, дзе працягваў працаваць трактарыстам.

Любоў да тэхнікі, старанне, працавітасць прынеслі першыя поспехі маладому механізатару. 14.02.1975 г. К. Дз. Дабравольскі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені.

У 1976 г. ён атрымаў ордэн Працоўнай славы II ступені, а ў 1986 г. – ордэн Працоўнай славы I ступені. Неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі, дыпломамі, каштоўнымі падарункамі. Ён і цяпер праяўляе актыўную грамадзянскую пазіцыю, праводзіць сустрэчы з вучнямі ў школах, удзельнічае ў мерапрыемствах, якія праводзіць раённая ветэранская арганізацыя.

# *Забродскі Васіль Усцінавіч*



Нарадзіўся Васіль Усцінавіч у 1918 г. у г. Віцебску, закончыў Віцебскі медінстытут, Свярдлоўскую ваенна-медыцынскую акадэмію.

Выдатнік аховы здароўя СССР, заслужаны ўрач БССР – так радзіма адзначыла яго працу. У 1948 г. і 1968 г. быў узнагароджаны граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

У Вялікую Айчынную вайну партызанскі доктар Васіль Усцінавіч Забродскі ў брыгадзе асобага прызначэння імя Леніна ўзначальваў санітарную службу.

У зямлянцы пры святле газоўкі рабіў ён аперацыі. Часта замест наркозу параненаму давалі шклянку самагону. Не хапала аперацыйнага інструменту. Нават звычайная піла ішла часам у ход. І параненыя пасля аперацыі выжывалі

Даводзілася партызанскаму доктару ўдзельнічаць і ў дыверсійных аперацыях, трапляць пад бамбёжкі, прарывацца праз варожую аблогу. А аднойчы выводзіў з акружэння групу партызан без карты, толькі па компасе. Лясы ён ведаў нядрэнна. Аднаго разу доктар сам узначальваў аперацыю, у час якой адбілі ў немцаў жывёлу, прызначаную для адпраўкі ў Германію

Нялёгкім было і пасляваеннае жыццё спустошанай ворагамі зямлі. На 32 тыс. жыхароў раёна было тады толькі 2 дактары.

У 1946 г. В. У. Забродскага прызначаюць галоўным урачом Шаркаўшчынскага раёна. Былы панскі дом у Базымполлі прывялі ў належны стан, арганізавалі 5 аддзяленняў. Няпроста ўсё было: без святла, без тэлефона, у цеснаце, транспарт – толькі коні.

Забродскі правёў шмат аперацый, больш за 10 тыс. толькі паласных.

Побач з ім заўсёды была жонка – аперацыйная сястра Бася Сямёнаўна, былая медсястра ваеннага шпіталя. Радаваліся калі ў бальніцы ўпершыню загарэліся электрычныя лямпачкі, калі атрымалі першую санітарную машыну. Потым адзначыў наваселле радзільны дом. Выраслі новыя карпусы тэрапеўтычнага, дзіцячага, туберкулёзнага, інфекцыйнага аддзяленняў.

І ва ўсё гэта ўкладзены клопаты Васіля Усцінавіча, таленавітага хірурга, добрага арганізатара, чулага чалавека. Прыязджалі на работу ў раён і маладыя медыкі, лягчэй стала працаваць і галоўнаму ўрачу, бо гэта была дастойная змена.

Не забывалі Васіля Усцінавіча старыя партызанскія сябры, асабліва тыя, каго ён лячыў, ратаваў.

Васіль Усцінавіч гатовы быў аддаць сваю душу кожнаму хвораму, якому зрабіў аперацыю, мог гадзінамі сядзець каля хворага, мог ноччу прыйсці яго наведаць. Ён з гонарам прайшоў па жыцці, ні разу не парушыўшы клятвы Гіпакрата.

За гады сваёй медыцынскай працы выратаваў тысячы чалавечых жыццяў, падрыхтаваў вопытных урачоў, якія працягваюць яго высакародную справу.

# *Ермаловіч Анатоль Георгіевіч*

***трактарыст-машыніст***
***камунальнага унітарнага вытворчага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Гарадзец»***



На лінейцы гатоўнасці стаяць трактары і глебаапрацоўчая тэхніка, якая будзе выкарыстоўвацца ў час пасяўной кампаніі, і ў КУВСП “Гарадзец”. Заметна адрозніваецца ад іншых трактар МТЗ-82 Анатолія Георгіевіча Ермаловіча — памыты, пафарбаваны. Ён з вялікай адказнасцю, дасканала аглядаў яго. І не толькі да тэхнічнага агляду так рыхтаваўся механізатар. У яго кожны дзень трактар дагледжаны і, як кажуць, на хаду. А ўсё таму, што Анатолій Георгіевіч добра ведае і любіць тэхніку. У свой час ён закончыў Гарадоцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Некалькі гадоў узначальваў калектыў інтэнсіўнай працы, так званы КІП, які быў створаны ў сельгаспрадпрыемстве ў механізатарскім асяродку.

Калі такая арганізацыя працы страціла сваю актуальнасць, А. Г. Ермаловіч стаў радавым трактарыстам. Прайшло з таго часу 24 гады. За перыяд працы ў гаспадарцы тры папярэднія трактары яго выпрацавалі свой рэсурс. Цяпер, ужо чацвёрты год, ён выконвае розныя работы на трактары МТЗ-82.

У гаспадарцы распрацаваны план правядзення веснавых палявых работ. Кожны з механізатараў ведае, якую работу яму трэба будзе выконваць. Напрыклад, Анатолій Георгіевіч спачатку будзе ўносіць у глебу мінеральную падкормку, а затым з сеялкай СЗУ-5,6 высяваць сельгаскультуры. Кантроль за ім не патрэбен. Акуратна, захоўваючы ўсе патрабаванні тэхналогіі, праводзіць механізатар любыя работы на зямлі. А пры старанні і выніку працы аддача будзе адпаведнай. А. Г. Ермаловіч адносіцца да ліку перадавікоў вытворчасці гаспадаркі. Калектыў вылучыў яго кандыдатуру на прадстаўленне ганаровага звання “Чалавека года Шаркаўшчыны”.

# *Кавалёнак Валерый Ціафілавіч*



Імя **ВАЛЕРЫЯ КАВАЛЁНКА** даўно вядома жыхарам нашага раёна. Яго асноўная пасада — фатограф РКБА. Але ж у чалавека ёсць і шмат захапленняў, якім ён аддае ўвесь свой вольны час. Сярод іх — родная прырода з яе жывёльным светам. Валерый з'яўляецца сябрам рэспубліканскай грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны". У чэрвені гэтага года Валерый Кавалёнак арганізаваў перасоўную фотавыставу "Птушкі роднага краю." Яна пабывала ў выставачнай зале раённага цэнтра рамёстваў, у Велікасельскай сярэдняй школе-садзе, далейшы яе шлях у Іёды і іншыя месцы не толькі свайго раёна. Гэты чалавек не застаецца ў баку і ад вырашэння праблем па аднаўленні і захаванні буйнейшага ў Еўропе верхавога балота Ельня, прымае ўдзел у канферэнцыях па пытаннях акрэсленай праблемы, сам актыўна дапамагае прадстаўнікам грамадскіх арганізацый вырашаць задачы па захаванні біяразнастайнасці Ельні. Зараз Валерый майструе сінічнікі і шпакоўні, кармушкі для птушак, якія застаюцца ў нашых мясцінах на зімоўку. Спраў у яго хапае заўсёды.

# *Кавалёнак Юрый Вінальевіч*



З першага дня свайго ўтварэння калектыў Шаркаўшчынскага раённага аддзела Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь працуе ў адным і тым жа складзе пад кіраўніцтвам **ЮРЫЯ ВІНАЛЬЕВІЧА КАВАЛЁНКА** і вось ужо на працягу пяці гадоў захоўвае стабільна высокія паказчыкі ў аператыўна-службовай дзейнасці. Па выніках работы за 2016 год шаркаўшчынскія следчыя заваявалі трэцяе месца сярод аддзелаў сваёй катэгорыі па Віцебскай вобласці.

Высока адзначана і службовая дзейнасць начальніка раённага аддзела — ганаровае званне “Чалавек года Віцебшчыны” ў намінацыі “Закон і парадак” прысуджана падпалкоўніку юстыцыі Юрыю Вінальевічу Кавалёнку.

Пасля заканчэння школы ў нашым гарадскім пасёлку, Юрый Вінальевіч Кавалёнак спачатку атрымаў авіяцыйна-тэхнічную адукацыю, а ўжо падчас міліцэйскай службы завочна закончыў Акадэмію МУС.

Яго служба ў міліцыі пачалася 21 год назад, калі ў 1995 годзе прыйшоў працаваць участковым інспектарам у Шаркаўшчынскі РАУС. Як адзначае сам Юрый Вінальевіч, напачатку службы было няпроста. Вялікую падтрымку аказалі больш вопытныя супрацоўнікі, якія многаму навучылі сваіх маладых калег. Гэта Віктар Казіміравіч Крук, які ў той час працаваў старшым участковым, былы намеснік начальніка РАУС Раман Антонавіч Більдзюга, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі, Аляксандр Уладзіміравіч Аксючыц (былы начальнік РАУС). Ён вельмі ўдзячны ўсім гэтым людзям за дапамогу і падтрымку. На працягу 5 гадоў Юрый Вінальевіч працаваў участковым інспектарам міліцыі, потым з’яўляўся следчым аддзела дазнання РАУС, працаваў у крымінальна-выканаўчай інспекцыі, у аддзяленні прафілактыкі. У 2009 годзе стаў намеснікам начальніка Шаркаўшчынскага РАУС і начальнікам папярэдняга расследвання. З пачатку 2012 года, калі Указам Прэзідэнта было створана самастойнае ведамства — Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь, узначальвае калектыў Шаркаўшчынскага РАСК.

— За 5 гадоў работы, — кажа ён, — мы стварылі моцны калектыў, у аснове якога маладыя, кваліфікаваныя, прафесійна падрыхтаваныя супрацоўнікі з дастатковым вопытам следчай работы і неабходнымі асабістымі якасцямі. Дзякуючы гэтаму паспяхова вырашаюцца ўсе пастаўленыя перад аддзелам задачы.

Вольны ад работы час Ю. В. Кавалёнак стараецца праводзіць з сям’ёй, жонкай Ірынай Аляксандраўнай і сынам Аляксандрам. Падчас водпуску праехалі разам па памятных месцах Беларусі, бо кожны чалавек у першую чаргу павінен ведаць сваю краіну і яе знакамітыя месцы, упэўнены Юрый Вінальевіч. Захапляецца начальнік Шаркаўшчынскага РАСК і рыбалкай. Але ўсё ж для хобі ў кіраўніка райаддзела часу застаецца мала.

# *Катовіч Віктар Віктаравіч*



У аснове работы лаўрэата звання “Чалавек года Віцебшчыны-2014” Віктара Катовіча — увага да людзей. Такога жыццёвага прынцыпу прытрымліваецца старшыня Іёдскага сельскага Савета дэпутатаў **ВІКТАР ВІКТАРАВІЧ КАТОВІЧ**. Для гэтага чалавека, які нязменна працуе на дадзенай пасадзе амаль трыццаць год, першачарговымі задачамі ў рабоце з’яўляюцца вырашэнні шматлікіх пытанняў дастойнага жыццезабеспячэння мясцовага насельніцтва. У 43 населеных пунктах сельсавета, тры з якіх — аграгарадкі Іёды, Буеўшчына, Шыці, пражывае больш 1770 чалавек.

Нарадзіўся Віктар Віктаравіч ў вёсцы Навасельцы Германавіцкага сельсавета, скончыў Пастаўскае СПТВ. Працоўны шлях пачаў у якасці механізатара калгаса “Буравеснік”. Атрымаўшы сярэднюю спецыяльную адукацыю ў Лужаснянскім сельскагаспадарчым саўгасе-тэхнікуме, узначаліў у родным калгасе агранамічную службу. Перад службай у войску некаторы час працаваў на пасадзе галоўнага агранома калгаса “Шлях Леніна”. А з 1984 па 1986 гады з’яўляўся намеснікам старшыні па кормавытворчасці калгаса “Камінтэрн”. Кіраўніцтва раёна бачыла выдатныя арганізатарскія здольнасці маладога і перспектыўнага спецыяліста. Таму не дзіўна, што ў хуткім часе В. В. Катовіч быў абраны старшынёй Іёдскага сельскага Савета дэпутатаў. За шматгадовую добрасумленную працу ў органах мясцовага кіравання, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі Віктар Віктаравіч Катовіч неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі Віцебскага абласнога і Шаркаўшчынскага раённага Саветаў дэпутатаў, раённага выканаўчага камітэта. Па выніках працы за 2013 год яго імя занесена на Дошку гонару лепшых працаўнікоў Шаркаўшчынскага раёна.

Шостага лютага ў абласным цэнтры на цырымоніі ўзнагароджвання лаўрэатаў звання “Чалавек года Віцебшчыны-2014” Віктар Віктаравіч Катовіч быў адзначаны гэтай прэстыжнай узнагародай у намінацыі “Мясцовае кіраванне і самакіраванне”.

# *Качан Дзмітрый Іосіфавіч*

***трактарыст–машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці ім. Маркава***



На старонках раённай газеты часта сустракаецца прозвішча Іосіфа Станіслававіча Качана, як передавога механізатара КУВСП імя Маркава. У яго сям'і гадаваўся сын Дзмітрый. Хлопец змалку захапіўся тэхнікай. Як стаў падрастаць, з бацькам праводзіў летнія канікулы ў кабіне трактара. А калі цвёрда вырашыў, што стане механізатарам, то ўжо мог разабраць па запчастках і скласці трактар, бо часта рабіў рамонт разам з бацькам.

Закончыўшы школу, прайшоў паскораныя курсы навучання пры райсельгастэхніцы і з пасведчаннем трактарыста прыйшоў у КУВСП імя Маркава. Спачатку Дзіму выдзелілі старэнькі трактар МТЗ-82. Кіраўніцтва гаспадаркі заўважыла, што хлопец працуе старанна. Праз два месяцы малады механізатар атрымаў навейшы МТЗ-82. Адбыўшы тэрміновую службу ў арміі, Дзмітрый Качан не расчараваўся ў аднойчы выбранай прафесіі — стаў працаваць у саўгасе на трактары МТЗ-892. Ён не прэтэндаваў на новы, “выпрабоўваў” тэхніку і сябе. Цяпер Д. І. Качан паўнапраўны гаспадар навейшага камп'ютаразаванага трактара МТЗ-1221.

Па характару вясёлы, жартаўлівы малады мужчына знайшоў рамантыку і ў сваёй працы. Прырасла душа чалавека да зямлі.

“Каб не было ночы, то працаваў бы,” — так гаварыў механізатар, калі вялася ўборка збажыны. Сем уборачных кампаній за яго плячыма. А ў мінулым годзе на камбайне КЗС-1218 камбайнер намалаціў 1239 умоўных тон зерня. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў сярод маладых камбайнераў гаспадаркі.

— Прыемна, калі тваю працу цэняць. І не проста хваляць, але заахвочваюць матэрыяльна. Усё добра. Адно непакоіць, што няма жылля. Даводзіцца жыць сям'ёй у адным доме з бацькамі. А хацелася б сваё, уласнае гняздо віць, — сказаў на развітанне Дзмітрый Іосіфавіч.

# Клопаў Мікалай Васільевіч

***машыніст крана аўтамабільнага філіяла Шаркаўшчынскае дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 131 камунальнага унітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдзяржбуд»***




Як лётчык не можа пражыць без блакітнага неба, так я не ўяўляю ніводнага дня без руля аўтамабіля, — кажа машыніст аўтакрана ДРБУ-131 Мікалай Васільевіч Клопаў. — Любоў да тэхнікі мне прывіў бацька Васіль Мікалаевіч, працаваў ён вадзіцелем у ДБУ-26 на старэнькім ГАЗ-51. Так і я, адслужыўшы ў арміі, уладкаваўся ў гэту арганізацыю вадзіцелем бензавоза. А з 2006 года працую машыністам аўтакрана ў ДРБУ-131.

Па ўсім бачна, што прафесіяй сваёй Мікалай Васільевіч ганарыцца і паважае яе. З лагоднай усмешкай, нягледзячы на працоўную занятасць, ахвотна з намі пагутарыў не толькі аб справах, а і аб асабістым жыцці. У чалавека любая праца будзе спорыцца, калі дома яго чакае надзейны тыл — клопат, пяшчота і ласка другой паловы. Усе гэтыя якасці Мікалай Васільевіч смела аднёс у адрас сваёй жонкі Жанны Яўгеньеўны, з якой, дарэчы, у ліпені яны адзначаць сярэбранае вяселле.

— Гэта не проста работнік са званнем “Чалавек года Шаркаўшчыны”, — кажа начальнік арганізацыі В. В. Гарбузаў пра Мікалая Васільевіча, — гэта аўтарытэт для маладых нашых працаўнікоў, прыкладны сем’янін, надзейны сябра і памочнік у любой справе

# *Кожан Валянціна Антонаўна*

***начальнік сектара касавай работы разлікова-касавага цэнтра № 4 г. п. Шаркаўшчына аддзялення ОАО «Белаграпромбанк» у г. Глыбокое***



Мяне ўвесь час цікавіла прафесія касіра, які працуе з грашыма і не мае на іх ніякай спакусы. Аднойчы даўно, стоячы каля акенца касы Белаграпрамбанка, не ўтрымалася і задала гэта пытанне касіру Валянціне Антонаўне Кожан.

— Ведаеце, для мяне грашовыя купюры, — гэта як звычайныя паперкі, якім павінен быць наладжаны дакладны ўлік, — адказала яна.

Раней розныя разлікі вяліся наяўнымі грашыма. Вялікія сумы купюр даводзілася пералічваць касіру за працоўны дзень. Гэта і выдача грашовых сродкаў з разліковага рахунку, і праверка грашова-разліковых дакументаў з пункту гледжання законнасці, і выдача і прыём наяўных грошай ад арганізацый і індывідуальных асоб. Валянціна Антонаўна з кожным кліентам на працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці знаходзіць агульную мову, праяўляе цярпенне, уважлівасць, захоўвае вытрымку і спакой. Ужо 29 гадоў аддала яна банкаўскай сферы, зараз займае пасаду начальніка сектара касавай работы разлікова-касавага цэнтра № 4 г. п. Шаркаўшчына аддзялення ААТ “Белаграпрамбанк” у г. Глыбокае. Яна ажыццяўляе кантроль за работай касіраў сектара, у якім працуюць чатыры чалавекі, за належным выкананнем імі службовых абавязкаў.

Завяршаецца працоўны дзень, і дома Валянціна Антонаўна — звычайная гаспадыня, захавальніца сямейнага ачага. А клопатаў заўсёды хапае. Трэба падтрымліваць парадак у доме, у двары. Да таго ж, яна вельмі любіць кветкі, якія ў яе кветніку буяюць да позняй восені. Калі ўся прырода знаходзіцца ў чаканні восеньскіх халадоў, не перастаюць цвісці рознакаляровыя хрызантэмы, не баіцца першых замаразкаў ільвіны зеў, апошнімі фарбамі красуюцца ружы. Каб усё гэта радавала вока, неабходны пастаянны догляд, і без жаночых рук у гэтай справе не абыходзіцца.

Калі спытала ў Валянціны Антонаўны пра самыя шчаслівыя дні ў яе жыцці, яна не задумваючыся стала пералічваць:

— Самымі запамінальнымі былі тыя, калі закончыла Пінскі вучэбна-крэдытны тэхнікум і прыехала працаваць банк, дзе і цяпер працую. Другой важнай падзеяй у жыцці стала вяселле, калі звязалі свае лёсы вузамі Гіменея з Леанідам Пятровічам. І не менш шчаслівы дзень быў, калі нарадзіўся сынок Андрэй. Дарэчы, ён ужо сямейны чалавек і працуе ў Глыбоцкім Дэпартаменце аховы. Калі чалавек шчаслівы дома, калі яго паважаюць і цэняць на рабоце, то і дробязныя непрыемнасці (без іх у жыцці не абысціся) перажываюцца прасцей. За вялікую адказнасць, уважлівасць, высокую культуру абслугоўвання кліентаў і вылучыў калектыў Белаграпрамбанка В. А. Кожан на высокае званне — “Чалавек года Шаркаўшчыны”.

# *Кожан Вячаслаў Міхайлавіч*

***намеснік дырэктара вытворча-тарговага унітарнага прадпрыемства «Камплект-М»***



**ВЯЧАСЛАЎ МІХАЙЛАВІЧ КОЖАН** чалавек, які аднойчы выбраў для сябе прафесію дарожніка. Мэтанакіравана, з вялікім жаданнем паступіў і закончыў БНТУ з дыпломам інжынера-дарожніка і па накіраванню навучальнай установы прыехаў на малую радзіму. Прызначылі маладога спецыяліста дарожным майстрам ДБУ-26.

— Мне вельмі падабалася працаваць на дарогах, — дзеліцца ўспамінамі Вячаслаў Міхайлавіч. — Тут табе і творчасць і рамантыка…

Але праз пэўны час кіраўніцтва арганізацыі прапанавала папрацаваць у вытворчым аддзеле, стаць канторскім работнікам.

— Работа з паперамі, з лічбамі — гэта не маё, — кажа Вячаслаў Міхайлавіч. — Зноў пайшоў майстрам, а затым галоўным інжынерам у гэтую ж арганізацыю. 9 гадоў адпрацаваў на такой адказнай і цікавай пасадзе. Гэта была творчая работа, якая дазваляла ўносіць у паўсядзённасць сваё наватарства, прыдумваць штосьці новае. Цікава было працаваць з геадэзічнымі інструментамі, асабліва падабалася нівеліраваць мясцовасць. Праклалі шмат новых дарог, у прыватнасці Шаркаўшчына—Германавічы, Опса—Відзы.

Калі зменшыліся заказы на будаўніцтва дарог, само жыццё падказвала, што трэба шукаць новыя шляхі для выхаду з крызісу. Вось тады і было вырашана стварыць сваё прадпрыемства па перапрацоўцы драўніны. Спачатку рабілі загатоўкі для дзвярэй, якія пастаўлялі на Пастаўскую мэблевую фабрыку. Паступова сталі расшыраць вытворчасць.

І ужо 6 гадоў, як арганізацыя працуе самастойна па вырабу тары — драўляных паддонаў. Галоўнае, што вытворчае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства “Камплект-М” ніколі не займалася гандлем, а толькі вытворчай дзейнасцю. Ідзе 100 працэнтная рэалізацыя прадукцыі ў Францыю, Бельгію, Германію, Данію і іншыя краіны далёкага замежжа.

Вячаслаў Міхайлавіч з’яўляецца ўласнікам і заснавальнікам прадпрыемства ўжо 15 гадоў. Дарэчы, сын Міхаіл, атрымаўшы вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці праграміст, з’яўляецца намеснікам дырэктара па камерцыйных пытаннях.

У арганізацыі ёсць свой дырэктар — Іван Люцыянавіч Барыла, бухгалтэрыя, заняты працай 40—50 рабочых.

Вячаслаў Міхайлавіч Кожан трымае цесную сувязь з кіраўніцтвам раёна, па магчымасці, аказвае матэрыяльную падтрымку ў правядзенні некаторых раённых мерапрыемстваў.

# *Крук Віктар Фёдаравіч*



Ціхі зімовы вечар… Па свежаму бялюткаму снегу крочаць дадому пасля працоўнага дня жыхары райцэнтра, у мітусні перабягаючы дарожныя скрыжаванні, спешна паглядаючы на гадзіннік. У людскім натоўпе заўважаю чалавека, які павольным поступам ідзе па гарадскім тратуары, задумліва ўглядаецца ў твары прахожых, раз-пораз перакідвае свой позірк на пакрытыя серабрыстым інеем гмахі дамоў і галінкі дрэў, нібы шукаючы чарговую тэму для сваёй наступнай мастацкай работы.

Такім звычайным для сябе маршрутам на працягу дваццаці трох гадоў крочыць з дому на працу **Віктар Фёдаравіч Крук** — настаўнік Шаркаўшчынскай дзіцячай школы мастацтваў. Класны пакой мастака размяшчаецца ў адным з памяшканняў раённага Цэнтра рамёстваў. Дзеці — яго вучні — пасля школьных урокаў спяшаюцца вечарам у мастацкія майстэрні да свайго любімага настаўніка, зручна ўстанаўліваюць мальберт, бяруць у рукі фарбы і пэндзалем выводзяць на аркушы паперы малюнкі.

— Віктар Фёдаравіч, — пытаемся мы ў мастака, — а самі вы якім чынам сталі жывапісцам, што гэтаму спрыяла?

— Ведаеце, мой тата Фёдар Сцяпанавіч быў адмысловым цесляром і столярам, яго вырабы славіліся на ўвесь Глускі раён Магілёўскай вобласці, дзе я нарадзіўся, — адказвае наш суразмоўца. — Маці Ганна Пятроўна мела шляхецкае паходжанне, складала вершы, пісала маленькія апавяданні, імкнулася нам, сваім дзецям, перадаць любоў да прыгажосці. А першы графічны партрэт, наколькі памятаю, я намаляваў у чатырохгадовым узросце. Затым пачаў дасылаць уласныя малюнкі ў рэдакцыі дзіцячых газет і часопісаў. У сем гадоў паспрабаваў пісаць фарбамі, паступова вывучаць тэхніку малюнка і жывапісу. У школе я быў адказным за афармленне сценгазет, прымаў удзел у раённых выставах юных мастакоў.

У 1967 годзе я паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута імя Кірава. Мне вельмі пашчасціла вучыцца там у знакамітых жывапісцаў Фелікса Гумена, Івана Сталярова, Альберта Някрасава, Алега Арлова, Леаніда Дзягілева. Вышэйшую навучальную ўстанову скончыў з адзнакай. Паступіла прапанова ад кіраўніцтва факультэта застацца працаваць у інстытуце на кафедры жывапісу. Але я тады абраў іншы шлях — паехаў працаваць настаўнікам на родную Магілёўшчыну.

У Шаркаўшчыну  я трапіў дзякуючы жонцы Ларысе Васільеўне, якая родам з Шаркаўшчыны. Месца працы мне было прапанавана ў цяперашняй сярэдняй школе № 1, дзе выкладаў чарчэнне і маляванне. У другой палове 1980-х гадоў перайшоў працаваць на пасаду мастака-афарміцеля ў раённы Дом культуры. А з 1992 года і па цяперашні час нязменна працую настаўнікам Шаркаўшчынскай дзіцячай школы мастацтваў. Шаркаўшчыну я лічу сваёй другой радзімай, бо пражыў у гарпасёлку больш за сорак год. Тут маляўнічая прырода, на тэрыторыі раёна ёсць мноства архітэктурных пабудоў, старажытных сядзібна-паркавых комплексаў і шмат чаго іншага, што можа зацікавіць мастака з пункта погляду напісання ім твораў мастацтва. Я працую ва ўсіх жанрах жывапісу і графікі, але перавагу аддаю партрэту і пейзажу. У сваіх работах стараюся перадаць непаўторную індывідуальнасць мадэлі, адлюстраваць не толькі знешняе падабенства, але і характар чалавека, яго эмацыянальны стан. Прытрымліваюся такой думкі, што вобразы ў творах павінны быць псіхалагічна выразныя, інтэлектуальна напоўненыя.  Я ўдзельнічаю ў выставах з 1974 года, а сваю першую персанальную выставу арганізаваў у 1977 годзе. З той пары нават не памятаю дакладна, колькі іх было праведзена. Сярод больш значных мерапрыемстваў падобнага плану трэба адзначыць міжнародныя і рэспубліканскія мастацкія пленэры, прысвечаныя Іллі Рэпіну, Сяргею Жукоўскаму, Івану Хруцкаму, Напалеону Ордзе, Уладзіміру Караткевічу, Васілю Быкаву, Рыгору Барадуліну.

— Для мяне  стала прыемнай нечаканасцю ўдзел у цырымоніі ўзнагароджвання лаўрэатаў ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны-2014”, якая пакінула масу станоўчых уражанняў і цёплых успамінаў.  Лічу вялікім гонарам, што мая праца ў справе эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення адзначана такой вялікай узнагародай сярод шматлікіх дасягненняў заслужаных і паважаных людзей Віцебшчыны.

# *Кубліцкі Станіслаў Мікалаевіч*




З дзяцінства я шчыра палюбіў мясціны, дзе нарадзіўся і вырас, — кажа нам **СТАНІСЛАЎ МІКАЛАЕВІЧ КУБЛІЦКІ** — А калі закончыў Більдзюжскую сярэднюю школу, для сябе асабіста вырашыў, што застануся жыць і працаваць у сваёй гаспадарцы. Як і любога вясковага юнака, мяне вельмі цікавіла тэхніка — трактары і аўтамашыны. Таму, атрымаўшы ў Шаркаўшчыне вадзіцельскія пасведчанні на гэтыя транспартныя сродкі, пачаў працаваць у тагачасным калгасе імя Кутузава. Старшыня гаспадаркі Антон Сяргеевіч Марціновіч выдзеліў мне першы трактар — МТЗ-80. Адслужыўшы два гады ў арміі, не здрадзіў сваёй мары дзяцінства і зноў сеў за руль калгаснага трактара. Вось ужо 23 гады разам з іншымі механізатарамі шчырую на карысць роднай гаспадаркі. Пятнаццаты сезон у маім карыстанні знаходзіцца энерганасычаны трактар МТЗ-1221. Тэхнічныя характарыстыкі тут добрыя, а галоўнае, што ў яго высокая праходнасць. Гэта робіць трактар запатрабаваным у сельскай мясцовасці на ўсіх відах сельгасработ. Як прыходзіць час пасяўной кампаніі, чапляю з зімы падрыхтаваную сеялку СЗТ-5,4 і засяваю палеткі гаспадаркі. Калі ідзе корманарыхтоўка, займаюся транспарціроўкай зялёнай масы. Гэты від работ выконваю і ў зімовы час. Таму акрамя рамонту ў механічных майстэрнях, перыядычна падвожу кармы да жывёлагадоўчых ферм.

Станіслаў Мікалаевіч як перадавы механізатар знаходзіцца ў пашане ў кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства. У час вясенняй пасяўной кампаніі мінулага года ён загарнуў у глебу насенне зерневых культур на плошчы 724 гектары і заняў другое месца ў раёне. Дарэчы, ён неаднаразовы пераможца раённага спаборніцтва сярод механізатараў за арганізаванае і якаснае правядзенне сяўбы, за што атрымлівае Ганаровыя граматы райвыканкама і грашовыя прэміі. У 2013 годзе міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід Канстанцінавіч Заяц уручыў Станіславу Мікалаевічу дыплом за трэцяе месца ў краіне па перавозцы кармоў.

Чарговым прызнаннем яго шчырай працы стала прысуджэнне ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны-2016”.

— Нават сам не ведаю, чаму менавіта мне сярод вялікага мноства механізатараў Віцебшчыны выпаў гонар атрымаць такую высокую ўзнагароду з рук старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая Мікалаевіча Шарстнёва. Лічу, што кожны з тых людзей, якія руплівa і старанна працуюць у сельскай гаспадарцы, дастойны падобнага прызнання і пашаны.

# *Лаўрыновіч Іван Вацлававіч*

Хірургічнае аддзяленне цэнтральнай раённай бальніцы крыху больш пяці гадоў узначальвае **ІВАН ВАЦЛАВАВІЧ ЛАЎРЫНОВІЧ**. Загадчыкам ён быў прызначаны адразу пасля заканчэння Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта. Пасада кіраўніка аддзялення адказная, патрабуе высокага прафесіяналізму, навыкаў і вытрымкі. Нягледзячы на малады ўзрост, Іван Вацлававіч валодае ўсімі пералічанымі якасцямі.

— Аснову нашага калектыву складаюць тры ўрачы-хірургі, — кажа суразмоўца. — Акрамя мяне гэта яшчэ Аксана Уладзіміраўна Селіванава і Павел Генрыхавіч Качан. Усяго ж у аддзяленні працуюць больш трыццаці чалавек. У калектыве, у асноўным, моладзь, якая адказна ставіцца да выканання сваіх службовых абавязкаў. А іначай немагчыма, бо ад якасці нашай работы залежыць здароўе чалавека, а нярэдка і само жыццё.

Праца ўрача-хірурга складаная. Але спраўляцца з цяжкасцямі дапамагаюць калегі, а таксама сучасныя ўмовы раённай бальніцы. Пасля адкрыцця новай лячэбнай установы ўзрасла колькасць людзей, якія жадаюць прайсці курс не толькі планавага, але і пазачарговага лячэння. Медыцынскія паслугі ў бальніцы атрымоўваюць яшчэ і жыхары суседніх раёнаў. Усё гэта сведчыць пра якасць і даступнасць лячэння ў шаркаўшчынскай установе аховы здароўя.

Сумленная праца загадчыка хірургічнага аддзялення неаднаразова адзначалася граматамі цэнтральнай раённай бальніцы, упраўлення аховы здароўя Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта. У 2015 годзе рашэннем Шаркаўшчынскага райвыканкама Івану Вацлававічу Лаўрыновічу прысуджана Ганаровае званне “Чалавек года Шаркаўшчыны” па выніках працы за 2014 год. Узнагарода гэта, па словах калег загадчыка хірургічнага аддзялення і ўдзячных пацыентаў, пачэсная і заслужаная.



# *Ліпскі Дзмітрый Арсаноф’евіч*

***трактарыст-машыніст ААТ «Даватарскі»***



У выніку спецыфікі сельскай працы і стану жыцця, пры значнай падтрымцы маладых працаўнікоў, замацаванасць іх на сяле застаецца нізкай. Але той, хто змалку бачыў, як працавалі бацькі на зямлі, як іх за стараннасць і добрыя вынікі работы паважалі, застаўся жыць і працаваць у сельскай гаспадарцы. Да кагорты такіх адносіцца і трактарыст-машыніст ААТ “Даватарскі” Дзмітрый Арсаноф’евіч Ліпскі.

У сельгаспрадпрыемстве працаваў бацька механізатарам, на змену яму прыйшлі сыны — Дзмітрый і Мікалай.

— Праца мне падабаецца, ды і прывык ужо, — прызнаўся пры размове Дзмітрый Ліпскі. — Асабліва цяпер, калі паступае ў гаспадарку новая, энерганасычаная тэхніка, хочацца пазнаць яе тонкасці.

Працуе ён на трактары МТЗ-3022. Выконвае розныя сельскагаспадарчыя, уборачныя, пагрузачна-разгрузачныя работы, праводзіць асноўную і перадпасяўную апрацоўку глебы, сяўбу ў складзе шырoказахопных і камбінаваных агрэгатаў. Цяпер ён у асноўным задзейнічаны на культывацыі глебы.

А пачынаў Дзмітрый сваю працоўную дзейнасць з памочніка камбайнера на камбайне “Ліда-1300”. Першыя ўрокі майстэрства атрымліваў ад знакамітага тады камбайнера Паўла Мядзюхі. Затым была служба ў арміі. Вярнуўся ў родную гаспадарку, механізатару далі трактар К-744 і стаў працаваць самастойна. Паступова праяўляў свае працоўныя здольнасці, цягу да тэхнікі, старанне і стаў вылучацца сярод механізатараў сельгаспрадпрыемства, як перадавік вытворчасці.

У Ліпскіх добры дом у вёсцы Сасноўцы, які выдзеліла гаспадарка. Жонка Анастасія працуе прадаўцом у магазіне. Сыну Арцёму тры годзікі.

Малады механізатар праяўляе актыўнасць пры правядзенні розных мерапрыемстваў і конкурсаў. Д.А. Ліпскі тры гады запар з’яўляўся пераможцай раённага конкурсу прафесійнага майстэрства сярод маладых механізатараў раёна. У 2010 годзе стаў сярэбраным прызёрам, а ў 2011 — абсалютным пераможцай у асабістым і камандным першынстве абласнога конкурсу прафесійнага майстэрства сярод маладых механізатараў. На машынна-трактарным агрэгаце МТЗ-3022 з абаротнымі плугамі ППО-8-40 Дзмітрый Ліпскі так узараў глебу, што камісія ставіла яго работу ў прыклад не толькі перад удзельнікамі конкурсу, а ўсімі прысутнымі, у тым ліку і навучэнцамі Аршанскага механіка-тэхналагічнага ліцэя, дзе праходзіў гэты конкурс.

# *Лубянцова Ніна Мілецеўна*

***аператар машыннага даення ААТ «Даватарскі»***



Памятаецца той час, калі не існавала ніякіх межаў з прыбалтыйскімі краінамі. Тады дзяўчаты нашага краю паступалі вучыцца ў Даўгаўпілскае медыцынскае вучылішча. Паступіла і Ніна Мілецьеўна Лубянцова з вёскі Валожынкі ААТ "Даватарскі". Пасля заканчэння ўстановы дзяўчына пэўны час працавала медыцынскай сястрой у рэаніматалагічным аддзяленні адной з бальніц сталіцы Латвіі — Рыгі. Так склаліся абставіны, што праз пэўны час давялося вярнуцца на радзіму да сваіх бацькоў. Прыехала не адна, а з мужам Андрэем Уладзіміравічам — ваенным у адстаўцы, які прамяняў сонечны Кіславодск (адтуль родам) на беларускую вёску. Ніна Мілецьеўна не стала шукаць сабе работы па спецыяльнасці, а ўладкавалася даяркай на ферму, дзе да таго часу працавала яе маці. Андрэй Уладзіміравіч узначаліў будаўнічую брыгаду гаспадаркі.

З той пары прайшло 20 гадоў. У сям'і Лубянцовых выхоўваюцца два сыны — студэнты. Дзяніс — будучы будаўнік, як і бацька, а Аляксей — аўтамеханік.

Каб матэрыяльна падтрымліваць студэнтаў і самім жыць у дастатку, Лубянцовы трымаюць на падворку дзвюх кароў, свіней, трусоў, курэй. Лішкі малака рэалізуюць дзяржаве.

— Цяпер працаваць на ферме стала намнога лягчэй, пасля таго як зрабілі ў кароўніку малакаправод, — стала расказваць пра свае працоўныя будні Ніна Мілецьеўна. — У групе 52 каровы, як і ў астатніх даярак, якія працуюць са мной побач — Ангеліны Баговіч, Наталлі Елубаевай і Людмілы Гудаковай. Доім тры разы ў суткі.

За мінулы год Ніна Мілецьеўна надаіла 227,5 тоны малака, што адпавядае 6313 кілаграмам на карову з прыбаўкай да папярэдняга года больш, як тысячу кілаграмаў. За студзень, люты гэтага года надаіла 21 тону і 588 кілаграмаў ад кожнай каровы. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў у гаспадарцы.

Як прызналася Ніна Мілецьеўна, нядаўна ў яе і мужа Андрэя Уладзіміравіча было сярэбранае вяселле — 25 гадоў сумеснага жыцця. Так што віншуем Лубянцовых з такой знамянальнай датай, а Ніну Мілецьеўну яшчэ і з ганаровым званнем "Чалавек года Шаркаўшчыны". Няхай у іх сям'і будзе заўсёды лад і згода, а праца прыносіць прыбытак і задавальненне

# *Майсяёнак Уладзімір Фёдаравіч*




На працягу двух дзясяткаў гадоў урачом анестэзіёлагам-рэаніматолагам працуе **УЛАДЗІМІР ФЁДАРАВІЧ МАЙСЯЁНАК,** які з 2002 года ўзначальвае аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы. У гэтым годзе Уладзімір Фёдаравіч стаў адным з лаўрэатаў звання “Чалавек года Шаркаўшчыны-2017”.

Будучы ўрач нарадзіўся ў вёсцы Дворнава, закончыў школу, потым Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Пачынаў працаваць урачом-анестэзіёлагам Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы, потым на працягу двух гадоў павышаў кваліфікацыю ў клінічнай ардынатуры на базе Віцебскай інфекцыйнай бальніцы. Вярнуўся ў свой раён, стаў загадчыкам аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі, у вёсцы Наваселле атрымаў дом, праз год стварыў сваю сям’ю.

— Урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг — гэта прафесія, якая як ні адна іншая павінна падыходзіць па духу. У ёй шмат асаблівасцяў. Дзяжурства можа прайсці адносна спакойна, і неабходна проста назіраць за станам цяжка хворага чалавека. А бываюць такія пацыенты, ад якіх не адысці, і трэба за некалькі хвілін прыняць правільнае рашэнне і дзейнічаць адразу, без прамаруджвання. Часам вельмі няпроста не толькі фізічна, але і эмацыянальна разумець, што ад тваіх канкрэтных дзеянняў у дадзены момант, ад хуткасці, уменняў і навыкаў залежыць жыццё чалавека. Работа ўрача — гэта цяжкая фізічная работа, стрэс, барацьба са смерцю. Але гэта яшчэ і адна з самых неабходных у свеце прафесій, якая актыўна развіваецца, асабліва ў апошнія гады. Развіццё медыцыны немагчыма без сучасных тэхналогій у галіне рэанімацыі і анестэзіялогіі. Уся неабходная апаратура, у адпаведнасці са стандартамі, у Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы ёсць. І ўрач анестэзіёлаг-рэаніматолаг павінен разбірацца не толькі ў фізіялогіі, але і ў тэхніцы і электроніцы.

Па словах Уладзіміра Фёдаравіча, паспяховую работу ў аддзяленні забяспечвае ўвесь дружны, стабільны калектыў медработнікаў, у аснове якога вопытныя супрацоўнікі — урачы, медыцынскія сёстры, малодшы медыцынскі персанал.

— За год праз аддзяленне рэанімацыі Шаркаўшчынскай ЦРБ праходзіць у сярэднім каля 500 чалавек, як правіла, да нас людзі паступаюць у вельмі цяжкім, часта беспрытомным стане, —адзначыў Уладзімір Фёдаравіч. — І калі праз некаторы час бачу сваіх былых пацыентаў, якія прайшлі неабходнае лячэнне і вярнуліся да паўнацэннага жыцця, на вуліцах нашага гарадскога пасёлка, разумею, што сваю прафесію я выбраў не дарэмна.

# *Маркелава Антаніна Антонаўна*

***жывёлавод ААТ “Буеўшчына”***



Жывёлавод адкрытага акцыянернага таварыства “Буеўшчына” **АНТАНІНА АНТОНАЎНА МАРКЕЛАВА** з’яўляецца дэлегатам пятага Усебеларускага народнага сходу ад нашага раёна. Гэта невыпадкова, бо жанчына — перадавы работнік гаспадаркі, сумленны працаўнік, клапатлівая жонка, маці і бабуля. Да таго ж, па выніках мінулага года Антаніне Антонаўне прысуджана ганаровае званне “Чалавек года Шаркаўшчыны”. Напярэдадні паездкі ў Мінск мы сустрэліся з жанчынай, пагутарылі пра надзённае.

— Ведаеце, я нават і цяпер поўнасцю не ўсведамляю, што менавіта мне пашанцавала стаць дэлегатам такога маштабнага рэспубліканскага форуму ад Шаркаўшчынскага раёна, — кажа Антаніна Антонаўна. — Нічым асабліва адметным я не вылучаюся сярод астатніх работнікаў нашага сельгаспрадпрыемства “Буеўшчына”. Са стараннем выконваю сваю работу, імкнуся, каб праца прыносіла плён не толькі мне, але і паляпшала вытворчыя паказчыкі гаспадаркі.

Антаніна Антонаўна амаль дваццаць год працуе на ферме ў вёсцы Падобы, дзе даглядае цялят на дарошчванні. У жанчыны ў гурце ніколі не бывае падзяжу, а прывагі маладняку буйной рагатай жывёлы даволі высокія.

— У працы мне дапамагае муж Пётр, — працягвае Антаніна Антонаўна. — Ён шчыруе на той жа ферме, дзе і я, слесарам. Таму і дома, і на рабоце — мы разам. А калі муж і жонка побач і займаюцца адной справай, тады ў сям’і заўсёды будзе лад, згода і ўзаемаразуменне.

# *Матрунёнак Алена Пятроўна*

***прадавец 6-га разраду магазіна №133 в. Іёды Шаркаўшчынскага райпо***



Лаўрэат звання «Чалавек года Шаркаўшчыны» прадавец магазіна № 133 у аграгарадку Іёды Алена Пятроўна Матрунёнак працуе ў Шаркаўшчынскім райспажыўтаварыстве 35 гадоў.

А ў Іёдскім магазіне яна з 1985 года. Зразумела, што цудоўна ведае ўсіх сваіх пакупнікоў, вывучыла іх патрабаванні і густы. А значыць, галоўная задача магазіна па забеспячэнні сяльчаніна ўсімі неабходнымі таварамі заўсёды выконваецца. Дапамагаюць спраўляцца такія рысы характару, як адказнасць, сумленнасць, ды і вялізны вопыт работы за прылаўкам аказваецца дарэчы. Увогуле, Алена Пятроўна можа служыць прыкладам для маладых работнікаў. Валянціна Падоба, Ірына Валовіч, якія працуюць разам з ёй ў магазіне, вучацца ў сваёй старэйшай калегі прафесіяналізму.

Сумленная праца Алены Пятроўны адзначалася кіраўніцтвам райспажыўтаварыства граматамі і падзячнымі лістамі, яна неаднаразова прызнавалася адным з лепшых работнікаў арганізацыі, заносілася на раённую Дошку гонару. А атрыманае цяпер званне «Чалавек года Шаркаўшчыны» стала прыемным прызнаннем і дастойнай узнагародай за шматгадовую работу ў сферы гандлю раёна.

# *Міхалёнак Іван Іванавіч*




З веданнем сваёй справы выконвае свае службовыя абавязкі начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **ІВАН ІВАНАВІЧ МІХАЛЁНАК**. І не дзіўна, бо гэты чалавек з маладосці працуе на зямлі. Быў старшынёй калгаса, пэўны час узначальваў упраўленне райсельгасхарчу, а цяпер ужо больш дзесяці год на дадзенай пасадзе.

Вопыт і прафесіяналізм Івана Іванавіча Міхалёнка дапамагаюць яму ў рэалізацыі пастаўленых перад інспекцыяй задач. Асноўнымі тут з'яўляюцца дзяржаўны кантроль у галіне аховы навакольнага асяроддзя, забеспячэнне дзяржаўных органаў і грамадзян інфармацыяй аб стане і забруджванні навакольнага асяроддзя, прымаемых мерах па ахове прыроды, арганізацыя пашырэння экалагічных ведаў, узаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі. Не сакрэт, што і ў нашым раёне здараюцца выпадкі парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства. Найбольш часта сустракаюцца яны ў сельскагаспадарчай галіне. Гэта нездавальняючае ўтрыманне водаахоўных зон водных аб'ектаў, нерацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў, парушэнне правілаў па ўтылізацыі адходаў, недастатковае навядзенне парадку на адпаведных тэрыторыях.

На працягу двух год наш раён удзельнічаў у праекце “Малыя рэкі — вялікія праблемы”. Шмат захадаў для паспяховай рэалізацыі дадзенага праекта прыняў і асабіста Іван Іванавіч. Галоўным вынікам стала стварэнне на базе некаторых навучальных устаноў экалагічных клубаў і пастоў. А ў Германавіцкай СШ у наступным навучальным годзе плануецца адкрыццё сучаснага экалагічнага цэнтра па вывучэнні праблем экалогіі. У гэтым жа населеным пункце ў мінулым годзе адрэстаўрыравана гісторыка-культурная каштоўнасць — парк графаў Шырыных, які быў закладзены яшчэ ў 1782 годзе. Цяпер тут маляўнічы прыродны куток для адпачынку.

Іван Іванавіч Міхалёнак часта праводзіць сустрэчы са школьнікамі, прапагандуе экалагічную культуру, распавядае пра ўнікальнасць і непаўторнасць прыроднага багацця нашага раёна. Ён цвёрда ўпэўнены, што толькі сумеснымі намаганнямі можна зберагчы тую прыгажосць лясоў, азёр, балот і рэк, якія перадаліся нам ад продкаў у спадчыну.

5 лютага ў Віцебску старшыня абласнога выканаўчага камітэта Мікалай Мікалаевіч Шарстнёў ва ўрачыстай атмасферы ўручыў Івану Іванавічу Міхалёнку дыплом лаўрэата ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны” па выніках працы за мінулы год. Дадзеная ўзнагарода — яскравы доказ той мэтанакіраванай работы, якую праводзіць начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па захаванні флоры і фауны нашага рэгіёну.

# *Міхалёнак Ірына Генадзьеўна*

***намеснік начальніка па інтэнсіфікацыі і механізацыі сельскай гаспадаркі ўпраўлення райсельгасхарчу***



З кожным днём на палях мяняе свой колер збажына. Ярка жоўтае, наліўное, цяжкае калоссе хіліцца долу. Хутка застракочуць на палях камбайны. Больш падрабязна аб тым, як мяркуецца правесці важную сельскагаспадарчую кампанію — уборку ўраджаю, мы папрасілі расказаць намесніка начальніка райсельгасхарчу па раслінаводству Ірыну Генадзьеўну Міхалёнак.

— Ірына Генадзьеўна, якая па ліку будзе для вас ужо гэта ўборачная кампанія?

— Маладой дзяўчынай пасля заканчэння тэхнікума (затым была завочная вучоба ў сельгасакадэміі) прыйшла працаваць аграномам у “Сельгастэхніку” на базу па размеркаванні ўдабрэнняў, затым была пасада галоўнага тэхнолага палёў калгаса “1-е Мая”, імя Фрунзе. І ўжо 14 гадоў узначальваю раслінаводчую галіну ўпраўлення райсельгасхарчу. А ўвогуле, у сельскай гаспадарцы працую 36-ы год.

— За такі прамежак часу вы набылі вялікі вопыт работы. Азірнёмся назад, прыгадаем адметныя гады, калі была такая ўраджайнасць зерневых культур, што, як кажуць, засекі ламіліся ад збожжа?

— Год на год не прыходзіцца. Былі гады, калі атрымлівалі больш як па 30 цэнтнераў на круг. А памятаецца год, калі ў калгасе “1-е Мая” атрымалі толькі 14 цэнтнераў збажыны з гектара. Гэта ж вытворчасць пад адкрытым небам. Акрамя чалавечага фактара, часта надвор’е адмоўна дзейнічае на ўраджай на тым ці іншым этапе развіцця культур.

# *Паўловіч Святаслаў Станіслававіч*

***вадзіцель пагрузчыка ўнітарнага камунальнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Шаркаўшчынскага раёна***



Святаслава Станіслававіча Паўловіча мы сустракаем на ўчастку Узрэцкага лясніцтва Глыбоцкага лясгасу, дзе работнікі камунальнай службы нашага раёна былі занятыя нарыхтоўкай драўніны. Святаслаў на сваім пагрузчыку «Амкадор» дапамагаў з вывазкай і пагрузкай бярвёнаў. Нашу сустрэчу Святаслаў Станіслававіч пачынае з жартаў, і адразу становіцца зразумелым, што без дасціпнага слова ў гэтага чалавека не абыходзіцца ні гадзіны. Звычайна ў такіх людзей — вострых на язык — і работа спорыцца. У дадзеным выпадку гэта якраз так. Ва УКП ЖКГ Святаслаў працуе усяго 3 гады, а ўжо зарэкамендаваў сябе работнікам адказным, дысцыплінаваным, які з любой даручанай работай справіцца.

— Святаслаў на сваёй тэхніцы у нашай арганізацыі пастаянна запатрабаваны чалавек, — расказвае дырэктар УКП ЖКГ Валянцін Францавіч Бука. — Такі пагрузчык у нас адзін, і поле дзейнайсці для яго вялікае. Таму без работы ён ніколі не бывае. Задзейнічаны Паўловіч са сваім «Амкадорам» на нарыхтоўцы лесу і шчэпкі, зімой пастаянна ачышчае дарогі ад снегу і загружае яго на вывазку. Бывае, што і без выхадных даводзіцца працаваць. Лічу, што Святаславу заслужана выпаў гонар атрымаць званне «Чалавек года Шаркаўшчыны».

# *Рымчонак Раіса Станіславаўна*



На працягу 24 гадоў тэрапеўтычнае аддзяленне Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы ўзначальвае **РАІСА СТАНІСЛАВАЎНА РЫМЧОНАК**, якая ў 2015 годзе стала лаўрэатам звання “Чалавек года Шаркаўшчыны”. Гэта высокая ўзнагарода атрымана ёй заслужана, адзначаюць многія медыкі раёна, якія ўжо не адзін год працуюць у адным калектыве з Раісай Станіславаўнай. Менавіта ў гэтага тэрапеўта выдатна спалучаюцца высокі прафесіяналізм урача, жыццёвая мудрасць жанчыны і асаблівыя, сардэчныя адносіны да кожнага свайго пацыента. За чвэрць стагоддзя работы ў бальніцы іх было вельмі шмат.

Ураджэнка вёскі Дзікева нашага раёна, яна вырасла ў сям’і заслужаных педагогаў Станіслава Іванавіча і Галіны Віктараўны Лагун, і ў яе былі ўсе ўмовы для таго, каб таксама стаць добрым настаўнікам. Але Раіса выбрала для сябе іншы шлях. Яна скончыла школу з “залатым” медалём, медыцынскі інстытут з “чырвоным” дыпломам і пасля інтэрнатуры ў Наваполацку адразу вярнулася працаваць на малую радзіму, у наш Шаркаўшчынскі раён. На працягу 2 гадоў адначасова была ўчастковым тэрапеўтам і ўрачом стацыянара. А з 1992 года і па сённяшні дзень узначальвае тэрапеўтычнае аддзяленне.

-Пасля заканчэння вучобы я вярнулася працаваць у свой невялікі раён, дзе ўсе адзін аднаго ведаюць і кожны чалавек на віду,- расказала пра сябе Раіса Станіславаўна. — Таму, безумоўна, дома пачынаць працаваць было больш адказна, чым у новым незнаёмым горадзе. І ўсё ж ніколі не пашкадавала аб тым, што засталася ў Шаркаўшчыне, непадалёку ад бацькоў, ад многіх маіх родных, побач з людзьмі, якіх добра ведаю і якія зараз ужо добра ведаюць мяне.

Сапраўдны ўрач, нягледзячы на ўсе праблемы і цяжкасці, у любым выпадку і пры любых абставінах заўсёды застаецца ўрачом: і ў святочныя, і ў выхадныя дні, і на пенсіі. А сёння, азіраючыся на пройдзены шлях, жыву ў згодзе са сваёй душой, люблю сваю прафесію, адчуваю сябе шчаслівым чалавекам і іншага лёсу сабе не жадаю.

# *Свяцкі Аляксей Віктаравіч*

***майстар Шаркаўшчынскага раёна электрычных сетак філіяла «Глыбокскія электрычныя сеткі» рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскэнерга»***



Кім быць? У кожнага маладога чалавека гэта пытанне ўзнікае ў розны перыяд яго жыцця. Адны з маленства мараць аб будучай прафесіі, іншыя, пакуль не закончаць школу, ніяк не могуць вызначыцца, куды пайсці вучыцца. А ёсць і такія, хто выпрабоўвае розныя прафесіі, пакуль не знойдзе сваю. Пэўны час стаяў на раздарожжы і Аляксей Свяцкі. Пасля школы два гады правучыўся ў БДАТУ. Палічыў, што будучая прафесія гэта не яго прызванне, развітаўся з навучальнай установай і пайшоў служыць у армію.

Выпадкова, ці так ужо па жыцці патрэбна было, уладкаваўся працаваць у раён электрычных сетак. "Вось гэта маё", — вырашыў Аляксей. Спачатку быў проста рабочым, затым атрымаў патрэбныя навыкі, набыў веды (завочна закончыў вышэйшую навучальную установу па спецыяльнасці) і стаў працаваць майстрам эксплуатацыйна-рамонтнай брыгады РЭС. У яго падпарадкаванні пяць чалавек — электраманцёры, рабочыя. Работы брыгадай вядуцца планава. Галоўная задача, каб не гасла ў выніку няспраўнасцяў святло ў дамах і ў вытворчых памяшканнях, каб людзі заўсёды ішлі на працу з задавальненнем, бо там будзе камфортна.

Калектыў РЭС вылучыў А. В. Свяцкага на званне "Чалавек года Шаркаўшчыны" як перспектыўнага, маладога спецыяліста, які адчувае адказнасць за даручаны ўчастак работы, імкнецца асвойваць новае ў энергетычнай сферы

# Сіняўская Вера Іванаўна

***старэйшая медыцынская сястра палiклiнiчнага аддзялення ўстановы аховы здароўя «Шаркаўшчынская цэнтральная раённая бальнiца»***



Дзень жанчын — свята ўсіх прадстаўніц цудоўнай паловы чалавецтва, незалежна ад іх сацыяльнага статусу, узросту і месца работы. 8 Сакавіка ўсе жанчыны падобныя на першыя вясеннія кветкі — трапяткія, прыгожыя, у чаканні цяпла, пяшчоты і ўвагі. Гераіня дадзенага матэрыялу сёння таксама зусім іншая — не ў белым медыцынскім халаце, як прывыклі яе бачыць штодзень, а з букетам кветак, з таямнічым, загадкавым і такім жаноцкім позіркам, з мілай усмешкай, якая злёгку кранае яе вусны.

Вера Іванаўна Сіняўская і ў жыцці такая ж абаяльная, як і на здымку, лёгкая ў зносінах, прыцягальная многімі рысамі свайго характару. Працуе яна старшай медыцынскай сястрой у раённай паліклініцы. Як прызнаецца сама, прафесію сваю любіць, ды і выбрала яе невыпадкова — гэта была мара яшчэ з дзяцінства. Аб тым, што жыццёвая дарога выбрана правільна, яскрава сведчыць наступны факт — медыцыне яна аддала ўжо 26 гадоў і сёння бачыць сябе толькі ў гэтай справе. Не злічыць колькі за гэты час было зроблена ўколаў і працэдур, пастаўлена кропельніц, колькі пацыентаў, у прамым сэнсе, прайшло праз яе рукі! А ад таго, наколькі яны ўмелыя і спрактыкаваныя, а медыцынская сястрычка — спагадлівая і чулая, залежыць не толькі здароўе, але і настрой хворага чалавека. Нездарма кажуць, што добрае слова і шчырыя адносіны часам лечаць не горш за самыя дарагія лекі.

Вера Іванаўна — прафесіянал у сваёй справе, яна карыстаецца павагай і аўтарытэтам у калектыве і сярод наведвальнікаў лячэбнай установы. Зараз, на пасадзе старшай медыцынскай сястры, у яе крыху іншыя, чым раней, службовыя абавязкі. Іх яна выконвае гэтак жа добрасумленна і адказна, як і ва ўсе папярэднія гады сваёй працы. Яе прафесійная дзейнасць адзначана на ўзроўні раёна, але аб гэтым мы паведамім у адным з наступных нумароў газеты.

А зараз парадуемся вясне з яе нязменным абуджэннем прыроды, з першымі цёплымі сонечнымі промнямі і цудоўным святам прыгажосці і жаноцкасці. Напэўна, зусім невыпадкова 8 Сакавіка адзначаецца ў першыя вясеннія дні, бо разам з прыродай расцвітаюць нашы жанчыны — сонечныя, пяшчотныя, прыгожыя як сама вясна!

# *Сокалаў Мікалай Асеевіч*



**МІКАЛАЙ АСЕЕВІЧ СОКАЛАЎ** – цясляр жыллёвага фонду ўнітарнага камунальнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна. Менавіта пра такіх людзей адзін мудры чалавек калісьці сказаў: “І тапорная работа можа стаць ювелірнай, калі цясляр — майстар сваёй справы”.

— У сферу абавязкаў Мікалая Асеевіча ўваходзяць сталярна-цяслярскія работы па забеспячэнні цякучага рамонту жыллёвага фонду, а менавіта пад’ездаў, дахаў, вакон і дзвярэй, некаторыя іншыя функцыі, -адзначыў у час нашай размовы майстар участка жыллёвага фонду УКП ЖКГ Сяргей Ігнацьевіч Лагун. — За 25 гадоў сваёй працы ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна, Мікалай дасканала асвоіў усе віды цяслярскіх работ. Гэтаму чалавеку можна смела даверыць любое, нават самае складанае заданне. Людзі заўсёды задаволены работай Мікалая Асеевіча, пра гэта сведчаць і шматлікія станоўчыя водгукі і словы ўдзячнасці ў яго адрас ад многіх жыхароў райцэнтра. А цяслярскае рамяство, між іншым, лёгкім не назавеш, асабліва ў зімовы перыяд часу. Лічыцца, што людзі такой прафесіі павінны валодаць вынослівасцю і спрытам, што асабліва важна пры складаных умовах: на вышыні, у цеснаце, або пры неспрыяльным надвор’і. Без уважлівасці і акуратнасці таксама не абыйсціся. Часта даводзіцца працаваць і ў выхадныя дні, або затрымлівацца вечарам, у гэтым таксама спецыфіка нашай рабочай прафесіі.

А пасля напружанага працоўнага дня добра вяртацца дадому, у цяпло сямейнага ачага. У Таццяны Кірылаўны і Мікалая Асеевіча Сокалавых дзве ўжо дарослыя дачкі – Наталля і Таццяна. Унучачка Даша ў гэтым годзе пайшла ў першы клас. Разам са сваімі бацькамі яна таксама пражывае ў нашым гарадскім пасёлку. Вельмі рады за свайго сына – лаўрэата ганаровага звання “Чалавек года Віцебшчыны” і бацькі Мікалая – Асей Андрэевіч і Галіна Піманаўна Сокалавы, якія жывуць у вёсцы Каршункі .

Дома у Мікалая Асеевіча захоўваюцца Граматы і падзякі, атрыманыя за ўзорнае выкананне сваіх прафесійных абавязкаў. Сярод іх – нагрудны знак “Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі” Міністэрства ЖКГ Рэспублікі Беларусь.

# *Хахолка Ефрасіння Уладзіміраўна*

***жылоўшчык мяса філіяла «Шаркаўшчынскі кансервава-агароднінасушыльны завод» прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Полацкая ўніверсальная база»***



Адказнасць, стараннасць, мэтанакіраванасць — усё гэта рысы моцнага характару, якія дапамаглі Ефрасінні Уладзіміраўне Хахолка дасягнуць высокіх вынікаў у рабоце, за што яна і была ўдастоена звання “Чалавек года Шаркаўшчыны”.

Працуе Ефрасіння Уладзіміраўна жылоўшчыцай мяса ў філіяле “Шаркаўшчынскі КАСЗ ПУП “Полацкая УБ”.

Нарадзілася яна на хутары Сіпаліна Лужкаўскага сельсавета Шаркаўшчынскага района. Бацькі былі простымі рабочымі, ад іх Ефрасіння Уладзіміраўна пераняла любоў да працы, да роднай зямлі. Працавать даводзілася шмат, але для яшчэ маленькай дзяўчынкі гэта было толькі ў радасць. Скончыла Чарневецкую школу Глыбоцкага района, а далей сваё навучанне вырашыла працягваць у Віцебскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 46 лёгкай прамысловасці. Пасля атрымання патрэбнай адукацыі вярнулася на радзіму і пачала працаваць у Шаркаўшчынскім КБА. Там на працягу 20 гадоў Ефрасіння Уладзіміраўна старанна выконвала сваю працу і зарэкамендавала сябе працалюбным і адказным чалавекам. Працуючы ў КБА, сустрэла свайго будучага мужа Георгія Уладзіміравіча. У хуткім часе ў іх нарадзіўся сын Аляксандр. Цяпер ён з жонкай Кацярынай і дачкой Варварай жыве ў Віцебску. З 1999 года жанчына пачала працоўную дзейнасць на Шаркаўчынскім кансервава-агароднінасушыльным заводзе, дзе старанная выконвае свае абавязкі і па сённяшні дзень.

Калектыў вылучыў Ефрасінню Уладзіміраўну Хахолка на атрыманне звання “Чалавека года Шаркаўшчыны” не выпадкова. Сваёй працавітасцю яна паказвае прыклад маладым калегам у тым, што да кожнай справы патрэбны адказны падыход і неабыякавасць. У сваю чаргу, кіраўніцтва адзначае яе, як разумнага і адказнага спецыяліста, а калегі цэняць за спагадлівасць, працавітасць і мэтанакіраванасць.

Зусім нядаўна Ефрасіння Уладзіміраўна адсвяткавала свой 55-ы дзень нараджэння. Нездарма гэтыя дзве пяцёркі разам — мусіць, нехта там наверсе паставіў такую высокую ацэнку за выдатна пражытыя гады. Усе асноўныя цяжкасці і перыпетыі жыцця пражыты, акцэнты расстаўлены, прыярытэты вызначаны, ацэнкі выстаўлены — дзве пяцёркі! Гэта выдатны ўзрост, у ім мудрасць, прыгажосць і сіла, а наперадзе — толькі найлепшае. 55 — гэта вяршыня жыцця, вяршыня з якой, як на далоні, відаць усё пражытае і тое прыгожае, да чаго варта імкнуцца. Таму жадаем Ефрасінні Уладзіміраўне здароўя на доўгія гады, каб ажыццявілася ўсё жаданае і задуманае!

# *Цыркін Дзмітрый Дзяменцьевіч*




У Шаркаўшчынскі раённы вузел электрасувязі **ДЗМІТРЫЙ ДЗЯМЕНЦЬЕВІЧ ЦЫРКІН** прыйшоў працаваць 41 год назад, з іх больш чым два дзясяткі гадоў ён узначальваў калектыў сувязістаў.

Д. Д. Цыркін у свой час прайшоў усе прыступкі службовай лесвіцы: ад электраманцёра, начальніка ўчастка, начальніка цэха, да начальніка раённага вузла электрасувязі.Чатыры дзесяцігоддзі прамільгнулі як адзін дзень, паступова набываліся прафесіяналізм, вопыт і майстэрства. Мужчына ўсё жыццё адпрацаваў у адной арганізацыі і ніколі не шкадаваў, што выбраў для сябе менавіта такі шлях. Ён нарадзіўся ў нашым раёне ў сям'і працаўнікоў сяла. Закончыў Віцебскі тэхнікум электрасувязі і на працягу года працаваў па размеркаванні ў Омску, пасля чаго вярнуўся ў Шаркаўшчыну і пачаў сваю работу ў сістэме электрасувязі.

З той пары мінула ўжо 40 гадоў і сёння, дзякуючы дзейнасці гэтага кіраўніка і ўсяго падначаленага яму калектыву, шаркаўчане і ўсе жыхары раёна кожны дзень атрымліваюць магчымасць карыстацца поўным спектрам сучасных і даступных паслуг электрасувязі, сярод якіх тэлефонная сувязь, доступ у сетку Інтэрнэт, інтэрактыўнае тэлебачанне, шмат чаго іншага. Дзякуючы бесперабойнай рабоце ўсяго калектыву спецыялістаў Шаркаўшчынскага РВЭС, жыхары раёна атрымалі магчымасць заўсёды заставацца на сувязі, быць у зоне доступу і ў курсе падзей.

Плённая і рэзультатыўная праца шаркаўшчынскіх сувязістаў не засталася незаўважанай. Шмат узнагарод атрымаў і сам кіраўнік: званні "Ганаровы работнік сувязі Беларусі", "Чалавек года Віцебшчыны", "Чалавек года Шаркаўшчыны", ганаровыя граматы і дыпломы рознага ўзроўню.

# *Чарняўскі Пётр Міхайлавіч*

***трактарыст-машыніст сельскагаспадарчага адкрытага акцыянернага аб'яднання «Даватарскі»***



Вось-вось пачнуцца палявыя работы. Механізатары практычна адладзілі замацаваную за імі тэхніку. Нязначныя рамонтныя работы даводзілася зрабіць і механізатару ААТ "Даватарскі" Пятру Міхайлавічу Чарняўскаму. На трактары МТЗ-82 ён працуе толькі трэці сезон, таму дробныя непаладкі ліквідаваў у перапынках паміж асноўнай работай, па меры паступлення патрэбных запчастак. А так Пётр Міхайлавіч задзейнічаны то на адвозцы гною ад жывёлагадоўчых памяшканняў, то падвозіць кармы жывёле. Акуратна, прафесійна, шчыра выконвае механізатар любую даручаную справу. Якую б сезонную работу ён не выконваў — сяўба сельгаскультур, нарыхтоўка кармоў, уборка збажыны — Пётр Міхайлавіч у першых радах сярод механізатараў гаспадаркі. Дарэчы, на камбайне КЗС-1218 за мінулы сезон ён намалаціў 1328 умоўных тон зерня.

Поспеху П.М. Чарняўскага садзейнічае стаeранне і вялікі вопыт работы. Працоўны стаж механізатара ў адной і той жа гаспадарцы складае 30 гадоў.

Свой лёс з сельскай гаспадаркай звязала і яго жонка Алена Віктараўна, якая працуе апэратарам халадзільнай установкі на ферме Пялікі. Сын Мікалай — начальнік аддзялення Дворнава КУВСП "Гарадзец". Малодшы Сяргей выбраў будаўнічую спецыяльнасць.

По праву заслужыў П.М. Чарняўскі ганаровае званне "Чалавек года Шаркаўшчыны".

# *Шуман Вера Мефодзьеўна*

***мастацкі кіраўнік раённага Дома культуры***



«З песняй па жыцці!» З такім дэвізам з году ў год упэўненымі крокамі ідзе па жыцці мастацкі кіраўнік раённага Дома культуры, прыгожая і абаяльная жанчына Вера Мефодзьеўна Шуман. У Шаркаўшчыне і нават у раёне, напэўна, няма чалавека, які б не ведаў яе. “Я — работнік культуры закулісны, — кажа нам Вера Мефодзьеўна. — Не люблю быць у цэнтры ўвагі”. Рызыкнём з гэтай яе вымовай не згадзіцца. Музычныя нумары гурткоў, якімі кіруе Вера Мефодзьеўна — аснова канцэртных праграм, што ладзяцца ў райцэнтры. Ды і сама мастацкі кіраўнік шмат гадоў з’яўляецца ўдзельніцай народнага хору “Спадчына”, спявае сольна і ў вакальным ансамблі “Родныя напевы”.

Скончыўшы Полацкае педагагічнае вучылішча і Віцебскі педагагічны інстытут, пачынала свой працоўны шлях настаўніцай чарчэння і малявання ў Верацееўскай базавай школе. Адначасова была актыўнай удзельніцай мастацкай самадзейнасці пры мясцовым сельскім клубе. Затым, пераехаўшы жыць у Шаркаўшчыну, працаўладкавалася на пасаду метадыста ў Цэнтр пазашкольнай работы. Разам з вучнямі, удзельнікамі гурткоў, ладзілі мерапрыемствы рознага кшталту. Тут у жніўні 2000 года і быў створаны тэатр моды “Маленькая фея” (зараз тэатр эстраднай песні). Працуючы з 2003 па 2008 гг. настаўніцай музыкі і выяўленчага мастацтва ў Більдзюжскай СШ, асноўную работу сумяшчала з работай у РДК. Працавала над стварэннем новых аб’яднанняў. А зараз ужо чацвёрты год з’яўляецца мастацкім кіраўніком гэтай установы.

Вядома, выпадковы чалавек, як бы ні стараўся, не зможа працаваць у сферы культуры. Тут патрэбен прыродны задатак, творчы запал, уменне працаваць у калектыве, з калектывам і з вялікай глядацкай аўдыторыяй. А для Веры Мефодзьеўны работа складаней яшчэ і тым, што яе гурткоўцы — гэта дзеці, якія патрабуюць асобага падыходу. Сямігадовыя малышы — малодшы састаў тэатра эстраднай песні “Маленькая фея”. Старэйшая група — гэта сямі -, васьмі- і дзевяцікласніцы.

Яскравымі, запамінальнымі музычныя нумары робяць прыгожыя касцюмы, розныя аксесуары ўдзельніц калектыву, пашытыя ўласнымі рукамі Веры Мефодзьеўны. Пашыў адзення, вязанне, вышыванне — хатняе захапленне жанчыны, вынікі якога служаць аздабленнем сцэнічных касцюмаў выканаўцаў песень на сцэне.

.

На працягу 2011 года праходзіў музычны праект на сцэне РДК “З песняй па жыцці!” Ён падрабязна асвятляўся на старонках нашага выдання. Гэта распрацоўка Веры Мефодзьеўны Шуман і распрацоўка ўдалая, бо мела станоўчыя водгукі сярод насельніцтва як новае культурна-масавае відовішча. А яшчэ, дзякуючы праекту, стварыўся новы калектыў у раённым Доме культуры — вакальны ансамбль “Родныя напевы”, якім кіруе Вера Мефодзьеўна. Вось і праца на вынік.

Сваіх пераможных вяршынь дасягаюць і ўдзельніцы “Маленькай феі”. У 2008 годзе Таццяна Хахель заваявала першае месца на абласным маладзёжным праекце “Школа зорак”. Летась Паліна Вярыга, Дар’я Берніковіч, Надзея Булкіна і Святлана Лысёнак занялі трэцяе месца на рэспубліканскім конкурсе юных выканаўцаў эстраднай песні “Халі-Хало”.

А што тычыцца сям’і, то яна таксама “музычная”. Старэйшая дачка Анжэла працуе выкладчыкам харавога аддзялення дзіцячай школы мастацтваў. Малодшая Крысціна зараз студэнтка лінгвістычнага ўніверсітэта. У свой час была ўдзельніцай “Маленькай феі”. Музычна адораны, з выдатнымі галасавымі дадзенымі і зяць, муж старэйшай дачкі Уладзімір — пастаянны ўдзельнік культурна-масавых мерапрыемстваў. Ну і, канечне, муж Яўген, як пажартавала Вера Мефодзьеўна, не супраць паспяваць з зяцем у вузкім сямейным крузе. Працу, і звязаную з ёй пастаянную занятасць сваёй другой паловы, Яўген разумее і стараецца ва ўсім ёй дапамагчы.

Зараз Вера Мефодзьеўна распрацоўвае сцэнарый раённай урачыстасці “Чалавек года Шаркаўшчыны”, падбірае рэпертуар, канцэртныя нумары самадзейным артыстам. А ў хуткім часе (бо адпаведныя дакументы ўжо падрыхтаваны) яе выхаванцы, тэатр эстраднай песні “Маленькая фея”, набудуць званне “узорны калектыў” — вяршыня, да якой ішлі разам са сваім мастацкім кіраўніком трынаццаць год

# *Якімовіч Міхаіл Мікалаевіч*

***директор открытого акционерного общества «Ельня-Агро»***




**МІХАІЛ МІКАЛАЕВІЧ ЯКІМОВІЧ** працуе на пасадзе дырэктара ААТ “Ельня-Агра” роўна два гады. Аднак ён не навічок ў гэтай гаспадарцы. Міхаіл нарадзіўся і вырас у вёсцы Іванава, у сям’і калгаснікаў. Бацька большасць свайго жыцця аддаў працы механізатара ў калгасе. А апошнія дзесяць гадоў да пенсійнага ўзросту Мікалай Паўлавіч займаўся будаўніцтвам. Бацька перадаў сыну ўсю сваю жыццёвую энергію, багаты вопыт. Міхаіл змалку быў прывучаны да працы на зямлі, любіў з бацькам рамантаваць тэхніку, штосьці майстраваць. Таму і прафесію выбраў прыбліжаную да тэхнікі, да зямлі.

У 1991 годзе Міхаіл паступіў вучыцца на механіка ў Гарадоцкі саўгас-тэхнікум. Пару месяцаў правучыўся і падышоў тэрмін службы ў арміі. Пасля звальнення з войска ў запас, зноў працягваў вучобу ў тэхнікуме. Малады спецыяліст вярнуўся ў родную гаспадарку і быў прызначаны загадчыкам рамонтнай майстэрні. У 1999 годзе спатрэбіўся прараб у гаспадарцы. Выбар адразу паў на Міхаіла Мікалаевіча. Кіраўніцтва гаспадаркі ведала, калі штосьці не зразумее малады кіраўнік будаўнічай брыгады, падзеліцца сваім вопытам бацька.

За тры гады ў сельгаспрадпрыемстве сваімі сіламі былі пераабсталяваны кароўнікі на фермах Зорка і Юзэфова, праведзены капітальны рамонт свінакомплексу ў Зорцы і пераабсталяваны будынак пад цялятнік, зроблена шмат іншых будаўнічых работ. Дарэчы, будаўніцтва ў ААТ “Ельня-Агра” не спыняецца і па сённяшні дзень. Там заканчваецца мантаж абсталявання на малочнатаварнай ферме, якая ўзводзіцца практычна за ўласныя сродкі.

Міхаіл Мікалаевіч добра разумее сам і ставіць такую мэту перад спецыялістамі, што прыбытак, асабліва ў зімова-стойлавы перыяд утрымання жывёлы, атрымліваецца ад жывёлагадоўлі. А будзе малако і мяса толькі тады, калі жывёла накормлена, здаровая, дагледжаная, створаны спрыяльныя ўмовы для працы жывёлаводаў. Варта нагадаць, што ААТ “Ельня-Агра” адна з гаспадарак раёна, якая працуе з прыбыткам і мае на рахунку ўласныя грошы. Пры М. М. Якімовічу ўзрасла валавая вытворчасць малака і палепшылася яго якасць, павысіліся прывагі буйной рагатай жывёлы. Гарантам паспяховай работы выступаюць не толькі тэхналогіі, сучасная тэхніка і старанная праца ўсіх работнікаў, але і згуртаванасць усяго калектыву, які ўзначальвае Міхаіл Мікалаевіч Якімовіч.

# *Яфімаў Павел Паўлавіч*



Усю працоўную частку свайго жыцця прысвяціў рабоце на зямлі галоўны аграном адкрытага акцыянернага таварыства “Даватарскі” **ПАВЕЛ ПАЎЛАВІЧ ЯФІМАЎ.** У свой час пасля заканчэння Лужаснянскага саўгаса-тэхнікума малады спецыяліст некаторы час працаваў брыгадзірам калгаса “Буравеснік”. Паступова набіраўся вопыту ў сваіх старэйшых калег. Гэта паспрыяла таму, што ў хуткім часе Павел Яфімаў сам узначаліў аграномічную службу калгаса, а затым стаў і старшынёй дадзенай гаспадаркі. Працоўныя поспехі маладога кіраўніка калгаса і тыя вынікі, якіх ён змог дасягнуць разам з работнікамі “Буравесніка”, не маглі быць не заўважанымі з боку кіраўніцтва Шаркаўшчынскага райкама КПБ. Таму ў 1986 годзе Паўла Яфімава пераводзяць на пасаду намесніка начальніка райсельгасхарчу па кормавытворчасці.

— Працаваць, у большай ступені, прыходзілася з дакументамі, — кажа нам Павел Паўлавіч, — а гэта было не па мне. Цяга да зямлі і работа на ёй узялі верх. Былы старшыня тагачаснага калгаса імя Даватара Пётр Пятровіч Чабатаронак прапанаваў пасаду галоўнага агранома гаспадаркі. Без лішніх разважанняў я згадзіўся. Выдатны арганізатар спраў і вопытны спецыяліст, у якасці ўзнагароды за працоўныя дасягненні Павел Паўлавіч Яфімаў быў вылучаны ад нашага раёна ў склад абласной дэлегацыі на рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла “Дажынкі-2013” у Жлобіне. Тады ААТ “Даватарскі” атрымаў ураджайнасць зерневых культур звыш 30 цэнтнераў з гектара. А вось у мінулым годзе ў гаспадарцы ў сярэднім сабралі збожжа 46 цэнтнераў на круг, пшаніца дала 51 цэнтнер з гектара. У дзяржаўныя засекі “даватарцы” адправілі 9300 тон збожжа ў бункернай вазе, што аказалася рэкордам.

У высокіх паказчыках раслінаводства – вялікая заслуга галоўнага агранома, які штодзень дбае пра павелічэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. Яму знаёмы кожны гектар зямлі, яе механічны склад. Ён дакладна ведае, дзе, у які тэрмін і што трэба сеяць на тым або іншым участку, каб мець максімальны ўраджай. Па выніках працы за 2013 год галоўны аграном ААТ “Даватарскі” Павел Паўлавіч Яфімаў удастоены Ганаровага звання “Чалавек года Шаркаўшчыны”. У яго вялікае мноства грамат, падзяк і іншых узнагарод за самаадданую працу на карысць гаспадаркі. Сярод нядаўніх — Ганаровая грамата абласнога камітэта прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу і Ганаровая грамата Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

## Спіс літаратуры

**1.** Бурэц, А. З любой работай справіцца [С. Паўловіч] / А. Бурэц // Кліч Радзімы. - 2013. - 20 красавіка (№ 32). - С. 1.
**2**. Бурэц, А. Стварыць умовы для гарманічнага развіцця асобы [Л. Гараніна] / А. Бурэц // Кліч Радзімы. -2014.-5 лютага (№ 11). - С. 2.
**3**. Бурэц, А. Усё жыццё за прылаўкам [А. Матрунёнак] / А. Бурэц // Кліч Радзімы. -2013.-27 ліпеня (№ 60). - С. 1.
**4.** Латышонак, Л. Сонечныя і прыгожыя, як сама вясна! [В. Сіняўская] / Л. Латышонак // Кліч Радзімы. -2013.-6 сакавіка (№ 19). - С. 1.
**5**. Лаўрыновіч, Д. Заслужыла высокую ацэнку [Е. Хахолка] / Д. Лаўрыновіч // Кліч Радзімы. - 2013. - 11 верасня (№ 73). - С. 1.
**6**. Почёпко, Д. Научитесь любить природу [В. Ковалёнок] / Д. Почёпко // Кліч Радзімы. -2015. - 2 мая (№ 35). - С. 7.
**7**. Райчонак, А.Э. Верны клятке Гпакрата [В.У. Забродскі] / А.Э. Райчонак // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна. -Мінск: БЕЛТА, 2004. - С. 409.
**8.** Райчонак, С. Ганарыцца сваёй прафесіяй [М. Клопаў] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2013. - 1 мая (№ 35). - С. 1.
**9**. Райчонак, С. З песняй па жыцці! [В. Шуман] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2013. - 6 сакавіка (№ 19). - С. 2.
**10.** Райчонак, С. Мара дзяцінства стала асновай жыцця [Р. Рымчонак] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2014. - 14 чэрвеня (№ 48). - С. 2.
**11**. Райчонак, С. Працавалі на карысць роднага краю [К. Дабравольскі] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2017. - 14 студзеня (№ 5). - С. 2.
**12.** Райчонак, С. Прызванне сэрца і душы [І. Лаўрыновіч] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2015. - 20 чэрвеня (№ 49). - С. 2.
**13**. Райчонак, С. Руплівай працай шаркаўчан праслаўлены наш край [І. Лаўрыновіч] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2015. - 11 сакавіка (№ 20). - С. 1-2.
**14**. Райчонак, С. Сваё жыццё прысвяціў мастацтву [В. Крук] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2015. - 14 лютага (№ 13). - С. 1-2.
**15.** Райчонак, С. У аснове работы ўвага да людзей [В. Катовіч] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2015. - 18 лютага (№ 14). - С. 1-2.
**16**. Райчонак, С. Усё лепшае - дзецям [Л. Гаранта] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2013. - 8 чэрвеня (№ 46). - С. 1.
**17.** Райчонак, С. Чалавек года Шаркаўшчыны [раённая ўрачыстасць] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2014. - 9 красавіка (№ 29). - С. 2.
**18**. Райчонак, С. Чарговая перамога Каваленка [аб удзеле ў Міжнародным спаборніцтве “Залатая рысь”] / С. Райчонак // Кліч Радзімы. - 2017. - 14 студзеня (№ 5). - С. 1.
**19**. Сосна, К. Валерый кавалёнак - у ліку пераможцаў [В. Кавалёнак] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2014. - 22 кастрычніка (№ 84). - С. 1.

**20.** Сосна, К. Заслужанае звание [П. Чарняўскі] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2013. - 17 красавіка (№ 31). - С. 1.
**21.** Сосна, К. Збажына паспявае хутка [І. Міхалёнак] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2014. - 26 ліпеня (№ 59). - С. 1-2.
**22.** Сосна, К. Лепшы ў вобласці [Д. Ліпскі] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2013.- 22 мая (№ 41). - С. 1.
**23.** Сосна, К. Пашана па заслугах [Н. Лубянцова] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2013. - 10 красавіка (№ 29). - С. 1.
**24.** Сосна, К. Праца ў РЭС - тэта маё [А. Свяцкі] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2013. - 17 ліпеня (№ 57). - С. 1.
**25.** Сосна, К. Самая лепшая пасада [П. Яфімаў] / К. Сосна // Сельская газета. - 2016. - 6 студзеня (№ 2). - С. 3.
**26.** Сосна, К. Формула поспеху [А. Ермаловіч] / К. Сосна // Кліч Радзімы. - 2013. - 3 красавіка (№ 27). - С. 1.